Адзначце **метапрадметныя вынікі** засваення зместу адукацыйнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура».

Вучань

ведае грамадзянскую пазіцыю аўтара, сувязь яго творчасці з эпохай;

адстойвае і абгрунтоўвае свой пункт гледжання;

усведамляе сябе грамадзянінам беларускай дзяржавы і грамадства, ведае сваю этнічную прыналежнасць;

умее арганізоўваць пазнавальную дзейнасць; наладжвае супрацоўніцтва і прымае ўдзел у розных відах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

ведае біяграфіі, жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, творчасць якіх вывучаецца манаграфічна;

праяўляе здольнасць і гатоўнасць да самастойнай творчай дзейнасці; прытрымліваецца этычных і маральных норм зносін і супрацоўніцтва;

умее выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі ў вучэбна-пазнавальных мэтах, вылучаць галоўнае, істотныя прыкметы паняццяў, працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй;

здольны да эстэтычнага ўспрымання навакольнага свету;

праяўляе павагу да нацыянальнай культурнай спадчыны;

рацыянальна і бяспечна выкарыстоўвае інфармацыйныя камунікацыйныя тэхналогіі ў вырашэнні рознага роду задач;

праяўляе міжэтнічную і міжкультурную талерантнасць, павагу да чужога меркавання;

самастойна плануе шляхі вырашэння задач, выбіраючы для гэтага найбольш эфектыўныя спосабы;

ведае характэрныя асаблівасці эпохі, якая адбілася ў творах, тыповае, канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў іх змесце;

прагназуе вынікі; кантралюе, ацэньвае вынікі і карэктуе ў выпадку няўдачы навучальныя мэты і спосабы іх дасягнення;

праяўляе цікавасць да вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці, здольнасць і гатоўнасць да самастойнай творчай дзейнасці.

LIVEWORKSHEETS